УДК 94(476) “19”

# ДА ГІСТОРЫІ СТАНАЎЛЕННЯ ДРУГОГА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА (пачатак 1920-х гг.)

**Н. М. Пурышава**
(Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”,
кафедра гісторыі Беларусі і ўсходніх славян)

*У публікацыі распавядаецца пра перадумовы стварэння і першапачатковы перыяд дзейнасці Другога беларускага тэатра.*

Тэатр – арганічная частка нацыянальнай гісторыі. Працэс станаўлення прафесійнага беларускага тэатру быў цесна звязаны з драматычнымі палітычнымі падзеямі, якія перажывала Беларусь ў 1917–1920-х гг. Паказальна, што гэты працэс ішоў адначасова з пачаткам афармлення беларускай дзяржаўнасці. Ужо праз два тыдні пасля другога абвяшчэння БССР газэта «Звязда» змясціла паведамленне аб тым, што «14 верасня 1920 г. ва урачыстых абставінах у прысутнасці членаў Ваенрэвкама ССРБ і шматлікай пралетарскай публікі адбылося адкрыццё Беларускага дзяржаўнага теэатра» [1, с. 99]. Гэта быў БДТ-1, які зараз носіць імя Янкі Купалы. Нацыянальна арыентаванае кіраўніцтва рэспублікі супольна з нацыянальнай інтэлігенцыяй імкнуліся ўсебакова садзейнічаць станаўленню прафесійнага беларускага тэатру. Адной з галоўных задач у тэатральным будаўніцтве была падрыхтоўка высокапрафесійных кадраў. Народны камісарыят асветы БССР ў 1921 г. хадайнічаў перад Наркамасветы РСФСР аб адкрыцці ў Маскве беларускай драматычнай студыі. Пытанне было вырашана станоўча, і Наркамасветы БССР пачаў адбор студыйцаў. У адборы прымалі удзел і партыйные органы. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваўся ліст Міхася Чарота, адрэсаваны Цэнтральнаму Бюро КП(б)Б. У лісце малады паэт прасіл накіраваць яго вучыцца ў студыю. Ён растлумачыў сваю просьбу тым, што жадае атрымаць «лепшую артыстычную падрыхтоўку», арганізаваць заняткі па беларусазнаўству, а таксама, каб «глядзець за палітыка-асветнай працай студыйцаў». Па хадайніцтву вышэйшага партыйнага кіраўніцтва Акадэмічны цэнтр Народнага камісарыята асветы БССР камандзіраваў М. Чарота ў студыю дзеля правядзення партыйнай работы сярод студыйцаў. Усяго у першы набор было залічана больш за 30 юнакоў і дзяўчат [1, арк. 17].

Студыя ў Маскве пачала сваю працу ў лістападзе 1921 г. пры Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры (па-руску – МХАТ). З пачатку яна планавалася як оперна-драматычная. Але у тых умовах гэта было занадта цяжка ажыццявіць на практыцы. У снежні была праведзена рэарганізацыя, і студыйцы сканцэнтраваліся толькі на вывучэні драматычнага мастацтва. У студыі вучыліся такія выдатныя беларускія акцёры, як С. Станюта, В. Рагавенка, Т. Бандарчык, К. Саннікаў, А. Ільінскі. Прадстаўнікі кіраўніцтва БССР прыдавалі студыі вялікае значэнне. Стэфанія Станюта ўспамінала, што іх, маладых актцёраў, наведвалі ў Маскве старшыня ЦВК БССР А.Р. Чарвякоў і загадчык Беларускім дзяржаўным выдавецтвам З.Ф. Жылуновіч. Т. Бандарчык у сваіх успамінах дапаўняе

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэты спіс: у маскоўскую студыю час ад часу наязджалі страшыня Савета Народных Камісараў БССР І. Адамовіч (1924–1927) з жонкай С. Шамардзінай, якая працавала ў Наркамасветы БССР, частым госцем там быў тагачасны наркам асветы У. Ігнатоўскі. У той жа час беларуская грамадскасць, аб'яднаная вакол Інстытута беларускай культуры, апасалася, што студыя ў Маскве можа страціць нацыянальны твар. На пасяджэннях мастацкай секцыі Інбелкульта неаднаразова было прапанавана забяспечыць студыйцаў беларускімі п'есамі, а таксама – карыстацца беларускай мовай не толькі на сцэне, але і ў побыце. Праз пяць гадоў 18 акцёраў і 16 актрыс вярнуліся ў Беларусь і сталі асновай новага нацянальнага тэатра [2, арк. 75].

Адкрыццё ў Віцебску 21 лістапада 1926 г. Другога дзяржаўнага тэатра было падзеяй вялікага значэння для развіцця тэатральнага жыцця Беларусі. Перад пачаткам першага спектакля адбыўся ўрачысты сход, на якім прысутнічалі беларускія пісьменнікі Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Кузьма Чорны, госці з Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Чэхіі. Адкрыццё театра адбылося спектаклем «У мінулы час» І. Бэна. Артыст тэатра Цімох Сяргейчык успамінаў: «Каб павіншаваць нас пасля спектакля, на сцэну выйшаў Якуб Колас разам з Янам Райнісам і чэшскім прафесарам Неедлы. Яны шмат гутарылі з намі. Якуб Колас з вялікай любасцю, з вялікім замілаваннем знаёміў нас з імі. А як ён цёпла гутарыў з намі! Як любіў моладзь!» [3, с. 69].

Акцёры новага тэатра прынеслі ў беларускае тэатральнае мастацтва традыцыі МХАТ, наватарскія ідэі «сінтэтычнага тэатра». Вялікі ўплыў, па словах С. Станюты, зрабіла на маладых акцёраў творчасць В.Э. Мейерхольда. Першымі спектаклямі тэатра былі пераважна студыйныя пастаноўкі, падрыхтаваныя да выпуска. Сярд іх найбольшую цікавасць выклікалі народная драма «Цар Максімілян», «Апраметная» В. Шашалевіча, «Чорт і Баба» Ф. Аляхновіча, «Вакханкі» Эўрыпіда, «Эрас і Псіхея» В. Жулаўскага, «Сон у летнюю ноч» У. Шэкспіра. Гэтыя спектаклі вызначаліся яркасцю, пластычнасцю, эксперыментальнасцю. Яны атрымалі прызнанне тэатральна дасведчаных глядачоў. В. Ластоўскі, які знаходзіўся ў лістападзе 1926 г. у БССР, успамінаў: «Ігралі Шэкспіраўскую штуку "Сон у летнюю ноч" у Мэерхольдаўскай пастаноўцы. Гэта найнавейшы зварот у тэатральным мастацтве, дзе кожды рух, кожды жэст выстылізаваны, выпрацаваны. Затое сцэна дае запраўды ўражанньне фантастычнага сна, з-пад якога трудна выйсьці, нават пакінуўшы тэатр». Пад уплывам тэатральных уражанняў, якія ён атрымаў у Віцебску і Мінску, В. Ластоўскі зрабіў вывад: «Радзянская Беларусь стварыла беларускі тэатр» [4, с. 90]. Як вялікае свята ў грамадскім і культурным жыцці Беларусі ацаніў адкрыццё новага тэатра Змітрок Бядуля: «Новы выгадаваны, выадукаваны ў адзін час, у адной школе калектыў патрапіць стварыць тэатр беларускі не толькі па мове, але і па духу, на глебе нацыянальнага хараства нашага народу…» [5, арк. 1].

Аднак малады тэатр адразу сутыкнуўся з цяжкасцямі. Далёка не ўсе глядачы былі падрыхтаваны да ўспрыняцця наватарскіх пастановак. Сумнення ў кіраўніцтва і ў так званай «працоўнай грамадскасці» выклікаў рэпертуар тэатра («Вакханкі» Эўрыпіда, «Сон у летнюю ноч» У. Шэкспіра, «Эрас і Псіхея» В. Жулаўскага і інш.). Крытыкавалі тэатр і за адсутнасць акцёраў – членаў камуністычнай партыі. 9 лютага 1927 г. канферэнцыя Віцебскага акружнога аддзялення Саюза працаўнікоў мастацтва адзначыла, што тэатр павінен скарэктаваць рэпертуарную палітыку ў бок сучаснай, палітычна актуальнай тэматыкі. Рэзалюцыя канферэнцыі прапанавала тэатру таксама ўключыць ў рэпертуар класічныя п'есы. Зазначалася таксама, што пастаноўкі тэатра павінны быць не толькі высокамастацкімі, але зразумелымі і даступнымі рабоча-сялянскай аудыторыі. Тэатр крытыкавалі і ў рэспубліканскім друку, ад яго патрабавалі спектакляў большай даступнасці і прастаты.

1920-я гг. – гэта толькі пачатак яскравага творчага шляху віцебскага тэатра. За доўгія 90 год тэатр перажыў шмат выпрабаванняў, нешта страціў, але і шмат здабыў. Тое, што было закладзена студыйцамі, перадаецца з пакалення ў пакаленне тэатра і жыве ў новых творчых поспехах тэатра.

**Літаратура**


1. Мастацтва Савецкай Беларусі : зб. дак. і матэр. : у 2 т. ; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск, Навука і тэхніка, 1976. – Т. 1 : 1917–1941 гг. – 400 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 523.
3. Протокол 3-го заседания театральной подсекции художественной секции Инбелкульта 19 марта 1925 г. // Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай Акадэміі навук РБ. – Ф. 1. Воп. 6. Спр. 6.
4. Шарэнда, В. Беларускі другі дзяржаўны тэатр (1926–1944 гг.) / В. Шарэнда // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 5. – С. 68–73.
5. Власт (Вацлаў Ластоўскі). Уражанні ад паездкі ў Беларускую Радавую Сацыялістычную Рэспубліку / Вацлаў Ластоўскі // Маладосць. – 1991. – № 1. – С. 88–107.
6. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 2289. Воп. 2. Спр. 106-а.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова